**Камека** Мікалай Мікалаевіч // Памяць. Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — С. 465.

## КАМЕКА МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ

Нарадзіўся 18 лютага 1966 г. у г. Новалукомль Чашніцкага раёна. Беларус. Член ВЛКСМ. Маці, Клаўдзія Фёдараўна, працуе поварам у прафілакторыі Лукомскай ДРЭС, бацька, Мікалай Канстанцінавіч, машыністам кампрэсарнай устаноўкі на заводзе «Этон». Мікалай скончыў СШ № 1 г. Новалукомля, у 7–9 класах вучыўся ў спецыялізаваных спартыўных школах у Віцебску і Мінску. Кандыдат у майстры спорту па веславанні. Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Новалукомскім ПТВ № 83 па спецыяльнасці электразваршчык. У красавіку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Чашніцкім РВК. Радавы М. М. Камека загінуў 26 ліпеня 1985 г. Пахаваны ў в. Старыя Лаўкі Чашніцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». Імя М. М. Камекі прысвоіна піянерскай арганізацыі новалукомскай СШ № 1, дзе ён вучыўся. Штогод праводзяцца раённыя спаборніцтвы юных хакеістаў на прыз ЛКСМБ імя Мікалая Камекі.

*…Разведгрупа ішла ў галоўным дазоры наперадзе асноўных сіл. Душманы прапусцілі яе, каб знішчыць увесь атрад. Аднак хлопцы заўважылі засаду. Завязаўся бой. Сілы былі няроўныя. Уся разведгрупа загінула, у тым ліку і М. Камека.*